**Н. В. Дзенісенка**
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ЭКСТРАКАРПАРАЛЬНАГА АПЛАДНЕННЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Праблема бясплоднасці не з'яўляецца новай. Аднак калі раней дадзенае захворванне практычна не паддавалася лячэнню, то з развіццём навукі, тэхнікі і медыцыны ў бясплодных пар з'явіўся шанец стаць бацькамі.

Вырашыць названую праблему могуць метады дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, адным з якіх з'яўляецца экстракарпаральнае апладненне (далей – ЭКА). Як сказана ў артыкуле 23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя», дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі прымяняюцца ў арганізацыях аховы здароўя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях [1].

Спецыяльным актам, які найбольш дэталёва рэгулюе адносіны ў названай галіне, з'яўляецца Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 года «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» (далей – Закон аб ДРТ). У адпаведнасці з гэтым Законам дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі ўяўляюць сабой метады аказання медыцынскай дапамогі, пры якіх асобныя або ўсе этапы зачацця і (або) ранняга развіцця эмбрыёна (эмбрыёнаў) да пераносу яго (іх) у матку ажыццяўляюцца ў лабараторных умовах [2].

Згодна з артыкулам 1 Закона аб ДРТ, экстракарпаральнае апладненне – гэта від дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, які заключаецца ў злучэнні сперматазоіда і яйцаклеткі па-за арганізмам жанчыны, развіцці эмбрыёна, які ўтварыўся ў выніку гэтага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

злучэння, і далейшым пераносе дадзенага эмбрыёна ў матку [2]. Такім чынам, у адрозненне ад іншага віду дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій – штучнай інсемінацыі – пры прымяненні ЭКА злучэнне сперматазоіда і яйцаклеткі адбываецца па-за арганізмам жанчыны і ў матку пераносіцца сам эмбрыён.

Згодна з артыкулам 6 Закона аб ДРТ прымяненне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій дапускаецца ў адносінах да асоб, якія дасягнулі 18 гадоў, валодаюць поўнай дзеяздольнасцю, а таксама прайшлі медыцынскі агляд і маюць медыцынскія паказанні і не маюць медыцынскіх супрацьпаказанняў да прымянення дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій. Пералік медыцынскіх паказанняў і медыцынскіх супрацьпаказанняў да прымянення дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, а таксама парадак правядзення медыцынскага агляду пацыента, у дачыненні да якога плануецца прымяненне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Так, пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 2019 г. № 124 зацверджаны пералік медыцынскіх паказанняў, а таксама пералік медыцынскіх супрацьпаказанняў да прымянення дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій (раней гэтыя пералікі вызначаліся пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 1 чэрвеня 2012 г. № 54). У пераліку медыцынскіх паказанняў да прымянення дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій вызначаны медыцынскія паказанні да правядзення штучнай інсемінацыі спермай мужа, медыцынскія паказанні да правядзення штучнай інсемінацыя спермай донара палавых клетак, медыцынскія паказанні да ЭКА (у тым ліку з выкарыстаннем донарскіх сперматазоідаў), медыцынскія паказанні да выкарыстання донарскіх яйцаклетак, медыцынскія паказанні да сурагатнага мацярынства [3].

Такім чынам, звярнуцца да ЭКА могуць толькі асобы, якія маюць пэўныя захворванні, якія перашкаджаюць нараджэнню дзяцей. Гэта ўяўляецца абгрунтаваным, паколькі, на наш погляд, неабмежаванае ажыццяўленне ЭКА здольна ў пэўнай ступені абясцэніць сацыяльнае значэнне сям'і, мацярынства, бацькоўства.

Пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 2019 г. № 124 таксама зацверджана Інструкцыя аб парадку правядзення медыцынскага агляду пацыента, у дачыненні да якога плануецца прымяненне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій [3]. Раней ўжывалася Інструкцыя з аналагічнай назвай, зацверджаная аастановай Міністэрства аховы здароўя ад 1 чэрвеня 2012 г. № 54.

Прымяненне ЭКА ў нашай краіне абмежавана шэрагам заканадаўчых умоў. Так, у прыватнасці:

– ЭКА не прымяняецца ў дачыненні да пацыенткі, якая дасягнула 50 гадоў;

– прымяненне методыкі ЭКА (як і іншых дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій) ажыццяўляецца арганізацыямі аховы здароўя, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію), якое выдаецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб ліцэнзаванні;

– для ўтварэння эмбрыёнаў пры ЭКА могуць быць выкарыстаны: а) донарскія яйцаклеткі, донарскія сперматазоіды (у дачыненні да пацыенткі, якая не знаходзіцца ў шлюбе, – толькі сперматазоіды ананімнага донара); б) палавыя клеткі асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе паміж сабой і якія сумесна звярнуліся да прымянення ЭКА; в) яйцаклеткі жанчыны, якая не знаходзіцца ў шлюбе і якая звярнулася да прымянення ЭКА;

– пры прымяненні ЭКА ў матку пацыенткі можа быць перанесена не больш за два эмбрыёны, а ў матку пацыенткі, якая дасягнула 35 гадоў, а таксама пацыенткі незалежна ад узросту, у дачыненні да якой прымяненне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій тры і больш разоў не прывяло да цяжарнасці, – не больш за тры эмбрыёны [2].

Часта пры прымяненні дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій выкарыстоўваюцца донарскія палавыя клеткі. У сувязі з гэтым заканадаўства Рэспублікі Беларусь прад'яўляе дадатковыя патрабаванні да донараў такіх клетак. Законам ад 18 чэрвеня 2019 года №200-З гэтыя патрабаванні былі зменены [4]. У прыватнасці, донарам сперматазоідаў можа быць мужчына ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў уключна (раней было да 40 гадоў), які не мае меды-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цынскіх супрацьпаказанняў да донарства і які прайшоў медыцынскі агляд. Ананімным донарам яйцаклетак можа быць жанчына ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў уключна (неананімным – ва ўзросце ад 18 да 49 гадоў), якая мае дзіця, не мае медыцынскіх супрацьпаказанняў да донарства і прайшла медыцынскі агляд. У папярэдняй рэдакцыі Закона не было адрознення ва ўзросце донара яйцаклетак ў залежнасці ад таго, з'яўляецца ён ананімным або неананімным: донарам яйцаклетак магла быць жанчына, якая дасягнула ўзросту 35 гадоў. Аднак агульным ў абедзвюх рэдакцыях Закона з'яўляецца тое, што неананімным донарам можа быць толькі сваяк пацыента (у дачыненні да пацыенткі – яе сваяк жаночага полу, у дачыненні да пацыента – яго сваяк мужчынскага полу) [2].

Такім чынам, мы бачым, што ў новай рэдакцыі Закона аб ДРТ быў павышаны ўзрост донара сперматазоідаў і неананімнага донара яйцаклетак (якая павінна з'яўляцца сваячкай пацыенткі). Гэта сведчыць пра павелічэнне кола суб'ектаў, якія могуць быць донарамі, што з'яўляецца сведчаннем лібералізацыі заканадаўства ў галіне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій.

Не можа выступаць у якасці донара асоба, якая ўчыніла цяжкае, асабліва цяжкае злачынства супраць чалавека [2].

Варта адзначыць, што вышэйпералічаныя змены ў заканадаўстве, якое рэгулюе прымяненне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, далёка не адзіныя.

Згодна з падп. 1.8 п.1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18.05.2020 № 171 «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян» з 1 студзеня 2021 г. бясплатна даецца адна спроба ЭКА (за выключэннем ЭКА з выкарыстаннем донарскіх палавых клетак) у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў, вызначаных Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, выключна сямейным парам, у якіх муж і жонка з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і ўзрост жонкі не перавышае 40 гадоў [5].

Ва ўсім свеце бязвыплатнае ЭКА прадугледжваецца ў выпадках, калі ўрачы пацвярджаюць высокі ўзровень паспяховасці. Бельгія, Данія, Грэцыя, Славенія, Швецыя – у некаторых краінах ЭКА робяць да «ўдачнага выніку», аднак у праграмы трапляюць жанчыны, чые шанцы вельмі высокія. Сітуацыя такая, што ў 20–25-гадовых жанчын шанцы зацяжараць ў выніку ЭКА роўныя амаль 50 %, у 33–36-гадовых – да 45 %, у 37–42-гадовых – да 37 %, а ў тых, каму больш за 42 гады, – не больш за 26 % [6]. Такім чынам, больш шанцаў зацяжараць у выніку прымянення ЭКА маюць жанчыны ва ўзросце да 40 гадоў. Гэтым і абумоўлена наяўнасць дадзенай ўзроставай мяжы ў вышэйзгаданым нарматыўным прававым акце.

Даванне бясплатнай спробы ЭКА з'яўляецца вынікам дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на павелічэнне нараджальнасці, пашырэнне даступнасці медыцынскіх паслуг, што з'яўляецца станоўчай тэндэнцыяй развіцця беларускага заканадаўства ў гэтай галіне. Тым не менш, беларускае заканадаўства яшчэ мае патрэбу ва ўдасканаленні.

Нярэдка ўзнікаюць пытанні аб магчымасці раскрыцця звестак аб біялагічным бацьку або сурагатнай маці. Здавалася б, прыярытэтам тут павінна быць тайна прыватнага жыцця, аднак за мяжой сутыкнуліся з наступнай праблемай. Некаторыя мужчыны выступалі ў якасці донараў спермы для нараджэння вялікай колькасці дзяцей. Былі выпадкі, калі дзеці, якія нарадзіліся ад аднаго бацькі-донара, па дасягненні шлюбнага ўзросту, не ведаючы пра тое, што з'яўляюцца блізкімі сваякамі, вырашалі ўступаць у шлюб. Гэта дало падставу для раскрыцця звестак аб біялагічным бацьку па заяве такіх дзяцей. Нягледзячы на тое, што згодна з часткай другой артыкула 12 Закона аб ДРТ палавыя клеткі аднаго донара могуць быць выкарыстаны не больш чым у 20 спробах апладнення, шанец кровазмяшэння ўсё ж такі ёсць. На наш погляд, раскрыццё звестак аб біялагічным бацьку або генетычнай маці не з'яўляецца рашэннем праблемы, паколькі, уступаючы ў палавую сувязь, не ўсе маладыя людзі даведваюцца пра імя бацькоў партнёра. Гэтую праблему можна вырашыць, паменшыўшы колькасць спроб, у якіх могуць выкарыстоўвацца палавыя клеткі аднаго донара. Для гэтага лічым неабходным частку другую артыкула 12 Закона аб ДРТ выкласці ў наступнай рэдакцыі:



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Палавыя клеткі аднаго донара могуць быць выкарыстаны не больш чым у 1 спробе апладнення, за выключэннем выпадкаў, калі апладненне не адбылося».

Такім чынам, можна зрабіць выснову пра тое, што заканадаўства Рэспублікі Беларусь накіравана на паляпшэнне ўмоў для ажыццяўлення працэдуры ЭКА з мэтай павышэння ўзроўню нараджальнасці і пашырэння даступнасці медыцынскіх паслуг. Пашыраецца кола суб'ектаў, якія могуць быць донарамі палавых клетак, абнаўляюцца пералікі медыцынскіх паказанняў і супрацьпаказанняў да прымянення ЭКА, даецца бясплатная спроба ЭКА пэўным катэгорыям асоб. У той жа час да працэдуры ЭКА могуць звярнуцца не ўсе жадаючыя, а толькі асобы, якія маюць адпаведныя медыцынскія паказанні. Гэта ўяўляецца абгрунтаваным, паколькі неабмежаванае ажыццяўленне ЭКА здольна ў пэўнай ступені абясцэніць сацыяльнае значэнне сям'і, мацярынства, бацькоўства. У той жа час існуюць пэўныя праблемы, выкліканыя пагрозай уступлення ў шлюб асоб, якія нарадзіліся ў выніку ЭКА з выкарыстаннем донарскага матэрыялу адной асобы, і звязанымі з гэтым негатыўнымі наступствамі (паколькі ў дзяцей, чые бацькі з'яўляюцца кроўнымі сваякамі, частаназіраюцца генетычныя захворванні). З мэтай прадухілення дадзенай пагрозы неабходна ўнесці ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь змяненні, звязаныя з абмежаваннем колькасці спроб апладнення з выкарыстаннем палавых клетак аднаго донара.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1 О здравоохранении: Закон Респ. Беларусь, 18 июня 1993 г., № 2435-XII [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2020. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 13.04.2020.

2 О вспомогательных репродуктивных технологиях: Закон Респ. Беларусь, 07 янв. 2012 г., № 341-З [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2020. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 29.09.2020.

3 О вопросах применения вспомогательных репродуктивных технологий: постановление Мин-ва здравоохранения Респ. Беларусь, 24 дек. 2019 г., № 124 [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2020. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 29.09.2020.

4 Об изменении Закона Республики Беларусь «О вспомогательных репродуктивных технологиях»: Закон Респ. Беларусь, 18 июня 2019 г., № 200-З [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2020. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 29.09.2020.

5 О социальной поддержке отдельных категорий граждан: Указ Президента Республики Беларусь, 18 мая 2020 г., №171 [Электронный ресурс] // Пресс-служба Президента Республики Беларусь. – 2020. – Режим доступа : http://president.gov.by/uploads/documents/2020/171uk.pdf. – Дата доступа : 29.09.2020.

6 Первую процедуру ЭКО женщинам до 40 лет можно сделать бесплатно, но есть нюансы. Какие? Рубрика «Будет дополнено» [Электронный ресурс] // ЗАО «Второй национальный телеканал». – 2020. – Режим доступа : https://ont.by/news/pervuyu-proceduru-eko-zhenshinam-do-40-let-mozhno-sdelat-besplatno-no-est-nyuansy-kakie-rubrika-budet-dopolneno. – Дата доступа : 29.09.2020.

**Н. А. Журович, О. Г. Дьякону**
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## ПРОИЗВОДСТВО ДЕЛ В АПЕЛЛЯЦИОННОМ ПОРЯДКЕ

В соответствии с частью 1 статьи 60 Конституции Республики Беларусь каждому гарантируется защита его прав и свобод компетентным, независимым и беспристрастным судом в сроки, установленные законом [1].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ